**Алена СУМКО**

# Дзеці і падлеткі ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі

***(па матэрыялах вуснай гісторыі Віцебшчыны)****

**СУМКО Алена Вячаславаўна.**

*Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нарадзілася ў Наваполацку. У 2000 г. скончыла Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці "Гісторыя". У 2004 г. скончыла аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2008 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму "Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай справе БССР (1919-1941)". З 2009 г.—дацэнт кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Займаецца гісторыяй штодзённасці, эканамічнай антрапалогіяй, праблематыкай вёскі і горада ў другой палове XX стагоддзя ў дыскурсе вуснай гісторыі. Працуе над доктарскай дысертацыяй "Культура жыццезабеспячэння беларускай вёскі ў перыяд пасляваеннага аднаўлення". Аўтар больш за 40 навуковых публікацый.*

**Дзеці ў сельскім соцыуме з ранніх гадоў прывучаліся да працы, якая была базавым элементам народнай педагогікі і сістэмы працоўнага выхавання. Практычна з малых гадоў практыкаваўся гендэрны падзел гаспадарчых абавязкаў. Хлопчыкі былі арыентаваныя на ўключэнне ў мужчынскі блок сельскагаспадарчай працы (даглядалі коней, вучыліся кіраваць імі ў вупражы, вырабляць нескладаныя прылады працы), а дзяўчынкі — жаночай (догляд за агародам і домам, кулінарныя навыкі, жаночыя рамёствы). У перыяд эканамічнай стабільнасці ў традыцыйнай беларускай сям'і размеркаванне і аб'ём абавязкаў залежалі ад узросту і полу. Аднак пад час крызісаў, абумоўленых неўраджаем ці наступствамі ваенных канфліктаў, роля дзяцей і падлеткаў у сістэме жыццезабеспячэння вёскі значна ўзрастала, бо ў складаных умовах насельніцтва незалежна ад узросту і полу імкнулася рэалізаваць увесь свой патэнцыял, каб стварыць прымальныя жыццёвыя ўмовы[1].**

Адным з такіх экстрэмальных перыядаў быў пасляваенны час, калі адбывалася ліквідацыя катастрафічных для Беларусі наступстваў Вялікай Айчыннай вайны. Чалавечыя і матэрыяльныя страты, знішчэнне тысяч паселішчаў, скарачэнне пасяўных плошчаў, падзенне ўраджайнасці адмоўна адбіліся на стане пасляваеннай вёскі. Найгоршыя ўмовы былі ў жыхароў раёнаў, дзе праходзілі карныя экспедыцыі нацысцкіх акупантаў. З 36 найбольш пацярпелых раёнаў рэспублікі 13 адносіліся да тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Сіроцінскі, Суражскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Мехаўскі)[2]. У сваю чаргу, цяперашняя Віцебшчына з 1944 па 1954 год была прадстаўленая Полацкай і Віцебскай абласцямі, сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж якімі былі абумоўленыя ўключэннем у склад першай заходніх раёнаў, якія ў міжваенны час уваходзілі ў склад Польшчы (Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Міёрскі, Пліскі і Шаркаўшчынскі раёны). Пасля вызвалення тэрыторыі ад акупантаў аднаўленне сельскай гаспадар-

---

* Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РФФД "Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX — начала XXI века", дамова № Г20Р-095.

кі ва ўсходніх раёнах праходзіла на аснове калгасна-саўгаснай сістэмы, у заходніх раёнах у першыя пасляваенныя гады пераважалі аднаасобныя гаспадаркі. У выніку рэгіён меў у сваім складзе раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу і неаднолькавымі стартавымі ўмовамі пасляваеннага аднаўлення. Аднак на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя сацыяльна-эканамічны і палітычны кантэкст мяняўся, а разам з ім і ўмовы жыццезабеспячэння.

Ва ўсходняй частцы Віцебшчыны пасляваеннае становішча было найбольш драматычным. Менавіта тут адбывалася большасць буйных карных экспедыцый ("Winterzauber" ("Зімовае чараўніцтва"), "Waldwinter" ("Зімовы лес"), "Schneehase" ("Заяц-бяляк"), "Greif" ("Грыф") і інш.). Некаторыя населеныя пункты былі цапкам знішчаныя альбо спустошаныя. Паказальным выглядае становішча ў вызваленым Расонскім раёне, дзе ў 10 з 16 сельскіх саветаў былі цалкам знішчаныя грамадскія і жылыя забудовы, сельскагаспадарчы інвентар і дамашняя жывёла, а з 38 000 даваенага насельніцтва засталося 17 508 чалавек, якія ва ўмовах ваенных дзеянняў 1944 г. пасяўныя работы не праводзілі[3]. Частка насельніцтва Расонскага раёна амаль год хавалася ў лясах, а частка была эвакуіраваная ў раёны Калінінскай вобласці. Пасля вяртання на вызваленую тэрыторыю людзі апынуліся ў экстрэмальных умовах, якія назаўсёды засталіся ў памяці мясцовых жыхароў:

*"Уся дзярэўня згарэўшы. Весь Расонскі раён счытай згарэўшы. На пянёк сталі, пастаялі, пакруціліся, нічога не было... бур'ян"* (Расонскі р-н)[4];

*"Мы пасля вайны прыехалі ў сваю дзярэўню і жылі, абстраіваліся, як маглі — ўсё ж папалена. Прыехалі: ні есці, ні піці — нічога. Ні каня, нічога не было. На сябе ўсё цягалі, рэзалі. Не дай Бог, што пасля вайны было"* (Расонскі р-н)[5].

Катастрафічную сітуацыю пацвярджаюць і архіўныя дакументы, згодна з якімі на снежань 1945 года 85% насельніцтва Расонскага раёна знаходзілася ў крытычным становішчы[6].1438 сямей (4448 чалавек) жылі ў зямлянках, не хапала прадуктаў харчавання, адзення, абутку. Каб выжыць, жыхары спустошаных раёнаў сыходзілі ў Заходнюю Беларусь ці Латвію. Сакратар Расонскага РК КП(б)Б паведамляў, што раён пакінула 3500 чалавек, а з некаторых калгасаў Гарбачэўскага сельсавета *"ушли все колхозники: кто смог двигаться"*[7]. Некаторыя вымушаны былі ісці на крайнія меры. У архіўных дакументах фіксаваліся выпадкі, калі дзяцей пакідалі на волю лёсу каля сельсавета ці, як гэта адбылося ў Дзмітрыеўскім сельсавеце, жанчына адвяла сваіх дзяцей у лес, распранула на марозе, каб яны загінулі, *"так как кушать им было дать нечего и некому их оставить"*[8].

Неабходна адзначыць, што магчымасці эканамічнай дапамогі з боку адноўленых пасля вызвалення калгасаў у найбольш пацярпелых раёнах былі вельмі абмежаваныя, бо яны самі знаходзіліся ў цяжкім стане, аб чым неаднаразова паведамляла калгаснае кіраўніцтва цэнтральным органам улады.

Змены ў эканамічнай рэчаіснасці адбіліся і на становішчы дзяцей і падлеткаў, якія ва ўмовах разрухі і голаду нароўні з дарослымі інтэнсіўна ўключаліся ў вытворчыя працэсы. Успаміны вяскоўцаў фіксуюць, што роля дзяцей у пасляваенным гаспадарчым жыцці вёскі была значнай:

*"Женщины восстанавливали и дети! Очень работали дети"* (Верхнядзвінскі р-н)[9];

*"Дзеці ўсё рабілі: за агароднінай мы ўхаджвалі, скаціну мы гадавалі."*.(Міёрскі р-н)[10].

Прычым у першыя пасляваенныя гады адбывалася дыфузія традыцыйных узроставых і гендарных абмежаванняў пад час выканання пэўных сельскагаспадарчых работ. Гэта было выклікана тым, што ва ўмовах спецыфічнай пасляваеннай дэмаграфічнай сітуацыі, калі значная колькасць мужчын загінула на вайне ці была мабілізаваная ў армію і на пачатак аднаўленчага перыяду адсутнічала ў вёсцы, падлеткі мусілі выконваць дарослую працу:

*"Так і спраўляліся. Брату было дванаццаць гадоў, мне — восем. Мы і сеялі самі, і пахалі самі"* (Міёрскі р-н)[11];

"... *картошку мы садзілі рукамі. Вот плуг і тут такая палка, а тут вот палка бальшая, і вот мы становімся з этага боку два і з этага боку два, а ззаді чалавек пашет, а мы ідзем бараздой, як лошадь цянем, а хто-та там дальше садзіў. Так і сеялі зярно"* (Сенненскі р-н)[12];

*"Мяне гадавала баба. Матка памерла ў партызаншчыну, а бацьку, калі "яжовыя рукавіцы", як гэта звалася перад вайной* (рэпрэсавалі. — А.С.)... *Мы, як сіроты... плуг цягалі, барану цягалі"* (Глыбоцкі р-н)[13];

*"Мы ў траём галодныя, а мама на ноч, как это... факелам свяціла трактару. Ну, а патом, как я ўжо падрос — дзесяць лет я ўже пахал. Не бальшой — не відна было"* (Расонскі р-н)[14].

*"После вайны мужыкоў ж не было. На вайне ўсе: хто пагіб, хто яшче не прышоў. Уручную ўсё время касілі на поле. Сена загатаўлівалі для ската, якібыў. І вот на кане работаў, сена вазіў. Брыгадзір, жэншчыны стагавалі сена, этот стог. Я вазіў сена. Ну, в обшчэм уся мельката да дзеці. Возілі эта сена ў кучу"* (Полацкі р-н)[15].

У неспрыяльных умовах падлеткам нярэдка прыходзілася выконваць ролю асноўнага кармільца ў сям'і. Узгадкі пра клопат дзяцей аб сваёй непрацаздольнай маці ва ўспамінах сустракаюцца досыць часта:

*"Мама пасколькі яна інвалід, яна не магла работаць, мы яе берaглі"* (Верхнядзвінскі р-н)[16].

*"Мама балела сільна. Ой, яе малярыя трасла і тады ангіна нейкая была, не дай Бог, гланды такія — гузы, а мы прыйдзем з сястрой, а тады пойдзем у лес, мы жылі каля лесу блізенька, дроў нацягаем ей... і апяць пашлі... Так і выжылі* (Расонскі р-н)[17].

Вусны дыскурс дае магчымасць зразумець, як пасляваенная рэчаіснасць адбілася на жыцці вясковай грамады, раскрыць матывацыю сацыяльных паводзін вяскоўцаў, механізмы іх адаптацыі і выжывання ў складаны час. Большасць сучасных рэспандэнтаў, якія могуць распавесці пра пасляваенны вопыт, — пераважна пажылыя людзі даваеннага і ваеннага пакаленняў,

якія былі ў разглядаемы перыяд дзецьмі або падлеткамі. Іх успаміны з'яўляюцца складовай часткай калектыўнай памяці, адрозніваюцца эмацыянальнасцю, што абумоўлена ўзроставай і гендарнай спецыфікай успрымання падзей, на інтэрпрэтацыю якіх уплываў вопыт сям'і рэспандэнта (сацыяльнага асяроддзя).

Рэспандэнты з заходніх і ўсходніх раёнаў Віцебшчыны вельмі красамоўна характарызуюць сваё дзяцінства, якое прыпала на ваенныя і пасляваенныя гады:

*"Маё детства малое прайшло: да 15 лет — вайна, а тут у мяне ўжо пашла ўзрослая жызнь з пятнаццаці* (Верхнядзвінскі р-н)[18];

*"Ну, тады ж цяжолыя пасляваенныя гады былі, бацька мой, яго ўбілі...,, гэта цяпер дзеці ў школу ходзюць, а мы ўжо кароў пасцілі, гадоў у трынаццаць я ўжо ў калхоз пашла, хадзілі і мальчікі, і дзевачкі ў калхоз. Лён рвалі, тады ж усё ўручную было. Цяжка было, дужа цяжка"* (Міёрскі р-н)[19];

"..в *школу я ж пошла в 46 году, первый год я не пошла, потому что болела очень, плохо было и одеть не было, не обуть ничего, а потом пошла уже в школу, школа была километра 4 от нас. Ну вот два дня мне отводилось на школу, один день на базар, остальное надо было работать"* (тагачасны Дунілавіцкі р-н)[20].

Вельмі актуальным, асабліва для найбольш пацярпелых раёнаў Віцебшчыны стала аднаўленне жылога і гаспадарчага фонду. Згодна з архіўнымі дакументамі ў Полацкай вобласці без прытулку засталося 34% сельскага насельніцтва, Віцебскай — 37,3%[21]. Значная колькасць рэспандэнтаў у сваіх успамінах пра першыя пасляваенныя гады ўзгадваюць, што пасля вяртання на вызваленую тэрыторыю людзі сутыкнуліся з суцэльным спусташэннем.

*"А тады, як после вайны начіналі жыць, прышлі на чыстае поле"* (Расонскі р-н)[22];

*"У нас спалілі ўсё датла ў 44-м гаду. Вясной усіх выгнапі з дзярэўні, на падводы... У Зябкі ў баракі гналі нас"* (Глыбоцкі р-н)[23].

У найбольш спустошаных раёнах першапачатковай задачей было будаўніцтва часовага жылля. У нарыхтоўцы будаўнічых матэрыялаў і самой будоўлі прымалі ўдзел усе члены сям'і, у тым ліку дзеці і падлеткі.

"*Дзяцёнкі, рэбяты, у нас мальчыкі былі малые, трое мальчышычэк. Яны, рэбяткі такія, пілілі пілой і хатку гэту паставілі"*(Расонскі р-н)[24].

Дзяўчынкі-падлеткі разам з бацькамі цягалі бярвенні, будавалі хату, асвойвалі новыя навыкі:

*"Нада ж было на себе насіць броўны з кустоў з гэтых, а мы яшчэ рабяты былі. Якія мы там былі?* [Пытанне: "Ну, вы з папам разам цягалі?"] *Да, вот старшая сястра ў нас была, і з папам. Вот папа ругаўся на яе, як толькі начнуць пііліць, у яе рука гэтая выскачыць з пілы..."* (Верхнядзвінскі р-н)[25]. Падлеткі ўдзельнічалі не толькі ў аднаўленні жылых памяшканняў для ўласнай сям'і, але і ў будаўнічай талацэ для аднавяскоўцаў:

*"Усё дзелалі, і хаты хадзілі рубіць. Вот после вайны, як раз на Грамніцы, рубіць.. мая сестра на ўглу стаяла, як мужчына. А мы меньшыя зразалі з пня і насілі на плячох. І хат шэсць, хат пастроілі, каторыя гэта сем'ям каторыя пагібшым"* (Расонскі р-н)[26].

Асобна трэба адзначыць, што ў першыя гады пасля вызвалення адной з пашыраных практык выжывання стала жабрацтва. Палявыя даследаванні фіксуюць успаміны пра жабрацкі промысел ва ўсіх раёнах Віцебшчыны. Прычым аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі паказвае, што калі ва ўсходніх раёнах успаміны пра пасляваеннае жабрацтва — гэта ўспаміны пра ўласны жыццёвы досвед, то ў заходніх пераважаюць успаміны сведкаў гэтай з'явы. Міласціна ў выглядзе прадуктаў харчавання давала магчымасць не толькі пазбегнуць галоднай смерці, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі. Дзеці і падлеткі разам з бацькамі, а іншы раз і самастойна, хадзілі жабраваць у раёны, якія ў меншай ступені пацярпелі пасля вайны — пераважна ў заходнюю частку Віцебшчыны, якая была ў параўнальна лепшым гаспадарчым становішчы, чым разбураныя ўсходнія раёны, а таксама ў Латвію. Жабрацкія маршруты залежалі ад розных фактараў: геаграфія пражывання, фізічныя магчымасці, узрост, сямейныя абставіны.

*"Хадзіла з мамай. Хто зерне атсыпець, хто хлеба кусочак, а сколька с Западнай там прынясеш?"* (Расонскі р-н)[27];

*"Многа з голаду паўмірала ў Валатоўках. Я помню вот бабка адна памерла, тады гэты Янук, які бульбу быў выкапаўшы, памер з голаду, тады такая Танька памёрла з голаду, і сама, і сын памёр з голаду. А мы не, мы не памёрлі, мы з сястрой хадзілі, ну як... па жэбрах, па старцах"* (Расонскі р-н)[28];

*"Тася — ні аднаго года не кончыла, яна па старцах хадзіла, прасіла. У Сакалішча, а там рака, паром быў, цераз той паром, што там за дзярэўня... "* (Расонскі р-н)[29];

*"Ну, вот торбачку возьмеш І пойдзеш. А што, калі ўсе галодныя?! Ездзілі ў эту самую, дальшэ туды, у Рыгу, у Латвію ездзілі, у Западную сюды, там жа там* лелей *жылі. І я ездзіла з маткай. Зойдзеш у хату—пакормяць. Што-нібудь там: баначку мукі ўсыпіць, хто круп, хто кусочак хлеба дасць. Хто што мог даць, то давалі. Ну і саберыцца торба. А тады як жа ідці? Паязды ж хадзілі, таварнікі, ну і тады падойдзеш к этаму таварніку, прыцішыць ход трошачку, там у Палаце, і бывала мяне скінець матка, а тады і сама, пад аткос паляцім, падымімся..."* (Полацкі р-н)[30];

*"Мы не хадзілі, а да нас пасля вайны з васточнай Беларусі прыхадзілі. Яны ж там папаленыя былі, бедна жылі, так ішлі да нас"* (Глыбоцкі р-н)"[31].

Разам з гэтым наратывы ўсходняй і заходняй Віцебшчыны фіксуюць, што захоўвалася класічная варыяцыя абавязкаў дзяцей па хатняй гаспадарцы. Выкананне такой працы, як збор ахрап'я ці праполка агарода, была "законам", пра які бацькі іншы раз не ўзгадвалі: *"Дык гэта наш закон быў! Гэта само сабой. Гэта ж ужо не загадваў ніхто. Гэта абычная работа, наламаць ахрап'я, пасеч"* (Міёрскі р-н)[32].

З улікам гендарнага складу рэспандэнтаў пераважаюць успаміны пра тое, як дзяўчынкі ўключаліся ў пра-

цу па гаспадарцы. Звычайна сюжэты звязаныя з традыцыйнай дапамогай маці з хатняй жывёлай і выкананнем жаночай працы.

*"Всё ўмела робіць, тое, што мама робіла.* [Калі вам сталі давяраць калаўрот?] *Можа гадоў было пятнаццаць. Эта ўжо фронт прайшоў. ..I я тады так прылежна, мама разрэшала мне для сябе прасць, як гэта раньшэ называлася, зрэб'і. Лён не часаны, а такі скудлочаны. Тоўсты такі, там можна было ткаць палавікі, можа ешчо такое, трантоўкі. Гэта зрэб'я аснавалі, а трантамі рвалі гэту адзежу ўжэ нягодную. Круглыя палавікі кручком плялі, а такі во тканы, дык ткалі ў кроснах.* [А вы калі навучыліся ў кросны?] *У кросны рана навучылася тожэ, ну як і прасць, гадоў у пятнаццаць, абы даставала толькі нагамі перабіраць. Пад вясну ў кросны ткалі, а сначала, калі дзень быў малы, пралі. Эта ж нада было напрасць, а тады ткаць*" (Міёрскі р-н)[33];

*"Мая мамка даже пасля вайны ткала, кросны былі і простані ткала, і я ей дапамагала"* (Шумілінскі р-н)[34].

Неабходна адзначыць, што сюжэты пра асвойванне ткацтва дзяўчынкамі ў пасляваенныя гады больш пашыраныя ў заходніх раёнах, аднак стварэнне даматканага палатна фіксуецца па ўсёй тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны.

Цікава, што ўспаміны пра гатаванне ежы дзяўчынкамі ў першыя гады пасля вызвалення практычна адсутнічаюць, гэта звязана, напэўна, з тым, што харчовыя запасы былі вельмі абмежаваныя і пашырана выкарыстоўваліся раслінныя субстраты, гатаванне якіх патрабавала пэўных ведаў і навыкаў. Таму з большага дзецям давяралі збіраць і падрыхтоўваць прадукты для далейшай апрацоўкі.

*"Асаку сабе сморгалі, на піражкі. Асачка, вот гэтыя сцебялькі* — гэта кароўцы ў пучочак звязана. *А сабе мамачка абсморгаець, і Зоечка з Лідачкай, Валодзя ня хоча: "Гэта не мая работа, я лучшэ пайду ахрапейка сеч". Мы сморгаем гэту асачку, а тады мама пасушыць, а тады ў ступе стаўчэць, а тады нейкіх там ашачкоў і тады піражкі. I ўсім па піражку"* (Верхнядзвінскі р-н)[35].

Самым распаўсюджаным абавязкам дзяцей у традыцыйнай беларускай сям'і быў дагляд старэйшымі дзецьмі за малодшымі. У паваенны час гэтая традыцыя захоўвала сваю актуальнасць.

*"Ой, як троху падраслі, так і нада было памагаць. Гэта мне ўжо было восем, як брацік наш радіўся. А сястрэ было дзесяць. І мы ўжо былі нянькі, і мы па дню няньчылі гэтага браціка — Жоржыка. Мой дзень з Жоржам, а яна ахрап'е будзе сбіраць, нада травы назбіраць, нада насеч секачом траву гэтую свінням"*[36].

Аднак ва ўспамінах пра першыя пасляваенныя гады часцей сустракаюцца факты пра тое, што дзеці становіліся "нянькамі" ў сем'ях сваякоў ці ў чужых (часта гарадскіх), больш заможных сем'ях, дзеля выжывання і дадатковага заробку. *"А я пашла рабят нянчыць. Сястра* (дачка мамінай сястры. — А.С.) *у горад была ўзяўшы, каб з голаду не падохла. Яна замуж зайшла і мальчык радзіўся і я глядзела. Нада было як раз ісці ў школу ў сенцябрэ, а яны мяне забралі і тры гады аднянчыла"* (Расонскі р-н)[37].

Іншы раз сустракаюцца факты пра тое, што сем'і з заходніх рэгіёнаў Віцебшчыны бралі дзяўчынак з усходніх раёнаў у якасці нянькі, каб уласныя дзеці мелі магчымасць хадзіць у школу.

Рэспандэнты, якія нарадзіліся перад самай вайной ці ў яе пачатку, звычайна ўзгадвалі, што малымі яны пасвілі хатнюю жывёлу і птушак. Аб'ёмы працы вызначаліся магчымасцямі гаспадарак. Асабліва часта пра пасьбу ўзгадваюць рэспандэнты заходняй Віцебшчыны, дзе захавалася пагалоўе хатняй жывёлы:

*"Вот ужо ў маю юнасць... пасля вайны пасцілі кароў. Вот і я лічна, стада там восем кароў: нашы, дедушкі, дяді. Вот і кажды дзень рэбяты, гэта іхная работа, пасцілі кароў і вот кагда ў сенцябрэ мы ў школу пайшлі, мая сестра маладзей на год за мяне, у разныя змены хадзілі, пагодкі, адна ў першую смену, другая ў другую. Ну вот адна на пасце, другая ў школу. Гэта прыходзіць, гэта іде на паству, а та ў школу. Пасцілі не як цяпер па палях, а ў лесе палянку нейкую там... Так і пасцілі"* (Міёрскі р-н)[38];

" *У всех была свая земля. Вот у папы было двадцать гектараў зямлі, папа вел бальшое хазяйства, четыре каня было. У нас было столько свіней — целое стадно, как в колхозе теперь, мы, дзеці, паслі свіней. Выганяем утром, у пять часоў паднімаемся ўсё, і хто кароў пасёт, кто овец, а кто свіней"* (Міёрскі р-н)[39].

Аднак пасьба была яшчэ і крыніцай заробку. Матэрыялы вуснай гісторыі з заходнебеларускіх раёнаў пра міжваенны час утрымліваюць інфармацыю пра тое, як дзеці за прадукты харчавання пасвілі жывёлу ў багацейшых гаспадароў:

*"А тады падраслі. Ужо ж сталі зарабляць, каторыя ж болей зямлі мелі багацей жылі, у гэтых жыта жалі, зараблялі. А тады прыйшлося папасціць дзе ў багацейшых хазяінаў. Адзін год пасціла і другі год пасціла. Па шаснаццаць пудоў хлеба за лета заробіла, што пасціла, бацькам. У бацькоў мы былі чатыры дачкі, пяты сын быў. Сям"я бальшая, нада была помац, а зямлі тока было чатыры гектары і тэй дрэнай"* (Браслаўскі р-н)[40].

Распаўсюджанымі з'яўляюцца аповеды пра аналагічныя заробкі "работнікаў"-падлеткаў з усходніх раёнаў Віцебшчыны. З большага яны займаліся выпасам жывёлы ці дапамагалі па хатняй гаспадарцы. У якасці аплаты звычайна выступалі прадукты: жыта, бульба, гарох і інш.

["Ну, а пасля вайны ці дужа ў Западную хадзілі?"] "У *Западную ішлі. Усё ж проста! Патаму што жылі аднаасобна. Мяне матка была завяла, трынаццаць лет мне было, і завяла за тры пуды хлеба за Чарневічамі. На пасту ганяў две каровы і штук дваццаць авец. Там аднаасобна яшчэ жылі, яны пахалі сваю зямлю, у іх кажнага быў футар, конь быў у іх.* [Вы летам пасвілі там?] *Летам пасвілі.* [І колькі заплацілі?] *Тры пуды. За ўсё лета, за восень. Ад вясны і да зімы.* [А як адносіліся?] *Елі разам. Я быў у двух хазяяў, іх поля схадзілася. Я адну нядзелю ў аднаго, другую — ў другога. У двух хазяінаў, у двух і харчаваўся"* (Ушацкі р-н)[41].

Сустракаліся і выпадкі, калі дзеці працавалі толькі за ежу, бо ўласныя бацькі не маглі іх пракарміць.

*"Самая беднасць была пасля вайны, патаму шта страна была разрушена. Самые бедные былі годы 45, 46, 47. Адзін раз мяне даже аддалі служыць. Эта первая зіма 45 года. Усю зіму, з вясны да вясны, у адной страрухі я была за служанку. Мне быў 14 год, я там спраўляла ўсе работы па хазяйству. У хазяйкі была карова, конь, авечкі, і я далёка насіла пад гару вёдры на кароміслы, насіла карову паіць, карове вады насіла. А кабыле насіла, ваділа на павадку туды на места, к сажалке, там папаю, кабыла так многа пьет, 4-5 ведра, многа выпіваець вады. Цяжэло было насіць, так я яе сама туда завяду і там напаю. Какая-то далёкая свацця нашым даваділася. Нічего ана мне не плаціла, толька карміла меня"* (Верхнядзвінскі р-н)[42].

Аналіз успамінаў паказвае, што ўладкаванне на працу ў заходнія раёны адбывалася ці праз знаёмых і сваякоў, ці, заўважыўшы на кірмашы руплівую дзяўчынку, гаспадары дамаўляліся непасрэдна з яе бацькамі. Паказальны ўспамін жанчыны з Верхнядзвінскага раёна пра тое, як адбываўся наём на працу:

*"А я езділа ў Западную да хазяеў. Папа мяне за руку, як васкрасенье, і павядзе. А западнік быў адтуль жа, прыязжалі на конях на пароме. І тады папа вадіў мяне за руку па базару. Людзі спрашвалі: "Куды ты дзяўчыну вядзеш? Прадаваць?" А ён і кажа: "А вот каму нада?! Яна можа і на паству ганяць і свіней пасьціць ...".Ну, вот тады... ай, скольки хазяеў было! Я ўсё лета на пасту ганяла. А ў іх 15 авец, дзве каровы, па цяленку. Хазяін ці хазяйка памагаюць прыгнаць, а тады я целы дзень пасу, пакуль хазяйка не прыйдзе даіць. Мне абед прынясе, і тады цэлы дзень. А калі сонца заходзіцца — саўсім закат, прыходзіць хазяін ці хазяйка і памагаюць у хлеў. і так усё лета. Мне плацілі зерном. Папа прыязджаў браў зерно — гэта была мая плата"* (Верхнядзвінскі р-н)[43].

Адным з напрамкаў часовай міграцыі для заробкаў стала суседняя з Віцебшчынай Латвія, куды дзеці разам з дарослымі, а бывала і адны, адпраўляліся, каб здабыць прадукты харчавання для сваёй сям'і.

*"Кушалі, што Бог даў. І траву всякую елі, апілкі дабаўлялі. Я ж пашла работаць, мне было 14 лет, пайшла па латышах, нас голад загнаў у Латвію. У нас нічога не было, наша дзярэўня спалена, мы па чужых углах скіталісь. Па латышах хадзілі з сястрой у зарабаткі. Нас прыглашалі. Там была такая маленькая деревенька, там 4 хутара. У адных параболі, ну патом і другіе ўзналі, што харошыя дзеўкі, што работаюць харашо... мы стараліся. І мы жалі, рвалі лён, палолі, сена зграблялі, малацілі — усё робілі і нам плацілі пол пуда в дзень, полпуда зерна в дзень зарабатывалі мы ў латышей"* (Верхнядзвінскі р-н (былы Асвейскі р-н))[44].

Тэма "заробкаў" захоўвае актуальнасць на працягу ўсяго аднаўленчага перыяду, але мяняецца іх матывацыя. Калі ў першыя гады пасля вызвалення дзіцячыя "заробкі" былі звязаныя з атрыманнем харчовых рэсурсаў для сям'і, то ў больш позні час яны былі выкліканыя задавальненнем ўжо патрэбаў іншага кшталту, напрыклад расходамі на адукацыю ці на адзенне. Прычым нават існавала канкурэнцыя за "рынак працы":

"*У дзярэўні многа дзяцей было, ну і стада настаяшча кароў было і пасцілі па лесу, было дужа цяжка, і вот нас (старэйшым нада было на работу хадзіць кажны дзень, настолькі было строга, што калі жанчына застанецца дома — 5 трудадней зрэзалі)... мы дзеці нанімаліся вот гэта 10 рублёў, як цяпер помню, 10 рублёў за гэтую пасту, за дзень. Так мы, у нас было даже такое, што вот еслі не нас пазавуць, а з другой сям'і, ужо прама абіжаліся. Патаму што было на кніжкі заработаць"* (Міёрскі р-н)[45].

Звычайным гаспадарчым заняткам дзяцей і падлеткаў было збіральніцтва. У пасляваенны час гэты промысел пачаў адыграваць значную ролю ў сістэме жыццезабеспячэння беларускай сям'і. У першы год пасля вызвалення дзеці займаліся зборам леташняй бульбы ці хадзілі па полі і збіралі каласкі пасля ўборкі ўраджаю.

*"Пойдзем, каб якую ежу прыспасобіць, яны ж вот вясной бульбу пераворваюць, прашлагодняя картошка яшчэ сварыца застаецца, мы прыбіралі сзадзі, некаторыя зноў пускалі, а некаторыя праганялі.* [А з кім вы хадзілі? З мамай хадзілі?] *Сам я хадзіў, саберымся і пайшлі.* [Толькі дзеці?] *Дзеці, да"* (Полацкі р-н)[46];

*"Хадзілі прасілі, бывала жнуць, нячыста ўбралі, нам мяхі давалі, мы ў мяхі сабіралі"* (Расонскі р-н)[47].

Апошняе было магчыма толькі са згоды кіраўніцтва калгаса. Аднак, калі яго не ўдавалася атрымаць, бацькі, спадзяючыся на тое, што дзяцей не пакараюць, іншы раз свядома адпраўлялі іх на нелегальную здабычу неабходнага для жыцця харчовага рэсурсу і не толькі пасля ўборкі ўраджаю:

*"Толькі зажываліся. Помню жыта паспела недалёка ад нас. Мама мяне паслала ў калосся — нарэзаць калоссяў. Я днём пайшла, зашла ад лесу, прысела так во і ножнічкамі шчып-шчып у такую каробачку, а жорны свае ў нас былі. А аб'езчык, так называўся, ездзіў на кані і аглядаў, і ўвідзіў мяне, прыбег і мяне за лапу валок да прадседацеля, а я плакала. Голад заставіляў усё дзелаць!"* (Расонскі р-н)[48].

Ва ўмовах недахопу базавых прадуктаў харчавання самым распаўсюджаным рэсурсам, неабходным для жыццядзейнасці чалавечага арганізму, станавіліся дзікарослыя расліны. Прычым колькасць раслін, якія выкарыстоўвалі для харчавання, пашыраўся за кошт тых зёлак, ці іх частак, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту практычна не выкарыстоўваліся ў ежу (шчавульнік, хвошч, асака і інш.). Але найбольшай папулярнасцю традыцыйна карысталіся шчаўе і маладая крапіва — каштоўная вітамінная сыравіна ў галодную веснавую пару.

*"Кісліца і крапіва — гэта не бяда. Асот елі! Насморгаем лісцікаў, зварым, ёсць чым — прыбелім, а нет і так хлебаем. Нічога не было"* (Расонскі р-н)[49];

"А, *ну кагда нарасцёт зелень, тогда ужэ мы жылі! Тагда шчавель з крапівой — гэта ужо харошыя шчы шчыталісь. Вкусна, кісленькія"* (Глыбоцкі р-н)[50].

Збіральніцтва давала неабходны мінімум, які дазваляў чалавеку не памерці з голаду і пратрымацца да новага ўраджаю. Пасля таго як знікла праблема галоднай смерці, збіральніцтва захоўвала актуальнасць, але

вярталася да сваёй звычайнай формы, калі збіраліся грыбы, ягады, некаторыя расліны (шчаўе, крапіва і інш.). У той час як дарослыя былі занятыя ў калгасе ці ў сваёй гаспадарцы, зборам займаліся пераважна дзеці.

*"Па осені сабіралі ягады, асобенна брусніку, клюкву. Взрослым хадзіць некагда было, ім же нада было работаць, іх же тады штрафавалі, еслі так, ну еслі, наказывалі кагда не выходзяць на работу, а дзеці хадзілі. Асобенна брусніку, брусніку сабіралі, смажылі, вот яе ў печку паставяць у чугун. Как сасмажэцца сделаецца, тада вылівалі ў бочку, сматря ў каго якая была, а зімой картошка і во эта бруснíка. Вот эта была тоже еда"* (Сенненскі р-н)[51].

Звычайна прадукты збіральніцтва ўключаліся ў штодзённы рацыён, разам з тым яны былі і крыніцай заробку. Ягады і грыбы падлеткі нярэдка прадавалі на кірмашах ці здавалі ў краму (нарыхтоўчы пункт), каб набыць неабходныя прадукты ці рэчы.

*"Набяром у кустах. Нас жа ў дзярэўні было многа малых. Дзярэўня была бальшая і нас было многа. Хадзілі ў лес. Ягады елі і прадавалі"* (Верхнядзвінскі р-н)[52];

*"Тады я ўжо падрасла* (прыкладна адзінаццаць гадоў. — А.С.), *тады ў горад езділі — хадзілі пешкам. Сабяром ягад якіх-небудь і нясем на плячах, вот так напрамкі, лесам і тады прыйдзем, прададзім тых ягад на базары, купім хлеба“* (Полацкі р-н)[53];

*"Вот малыя мы, сонца ўсходзіць. Лес далёка быў дужа. Мы ў клюкву хадзілі далёка. Ягады прадавалі і здавалі. Наберыш клюквы, здасі і куплялі тетрадкі, кніжкі, ручкі. Самі сабе. І ў маліны хадзілі. Ведро наберыш рана, а тады і на веласіпед ставілі і везлі здаваць. Веласіпед адзін быў. А так пяшком насілі"* (Міёрскі р-н)[54].

У пасляваенны час дапаможнай галіной жыццезабеспячэння, якая дазваляла падтрымліваць сістэму харчавання ва ўмовах недахопу базавых прадуктаў, было рыбалоўства. Рыба з'яўлялася важным рэсурсам, які дазваляў выжыць у неспрыяльных умовах, а таксама абменьваўся на іншыя прадукты харчавання. Ва ўмовах, калі бацькі былі на працы, рыбалоўствам у пасляваенныя гады актыўна займаліся дзеці. Снасці бацькі рабілі з падручных матэрыялаў, звычайна з лёну або канопляў, якія вырошчваліся на сваім падворку. У якасці лескі выкарыстоўвалі валасы з конскага хваста. Дзеці лавілі звычайна вудай і дапамагалі дарослым пры лоўлі жакамі ці сеткамі.

"[А як ён лавіў?] *Ставіў нараты, я ў яго нага балела, я з ім усё хадзіла, нараты тыя выцягіваць і ставіць. Ён выцягніць, скажыць мне там задзелаць, там жа дірка, нада было задзелаць, каб рыба ўжо не вылазіла, а даўней жа рыба лавілася не так як цяпер"* (Расонскі р-н)[55].

Пасляваенная рэчаіснасць паўплывала на гэты від промыслу, бо часта рэспандэнты ўзгадвалі, што рыбу здабывалі з дапамогай выбуховых рэчываў, якіх пасля вайны было дастаткова. Паводле ўспамінаў, больш буйную рыбу збіралі, а дробную, якая плавала ля берага падбіралі дзеці:

"[А другія глушылі?] *Канешне, яны ж настаяше, тады пайдзеш каля берага, мы ж там жылі недалека, а яе прыб'ецъ вална, калі вецер адтуль, прыб'ецъ бела-бела каля берагоў было рыбы.* [А вы збіралі вось гэтую рыбку, якую другія глушылі?] *Канешна, сабіралі, а як жа?! Дзе ж там без рабят абойдзешся, гэта ж наша самая еда была!"* (Расонскі р-н)[56].

Вельмі складаным быў першы год пасля вызвалення, калі працоўны дзень для калгаснікаў вызначаўся наступным чынам: *"Установить рабочий день в колхозах с восходом солнца и окончание с заходом солнца"*[57]. Ва ўмовах моцнай пасляваеннай дыспрапорцыі палаўзроставай структуры менавіта на плечы жанчын лягло аднаўленне калгаснай гаспадаркі, дзе зніжэнне механізацыі працы прывяло да павелічэння агульнай працоўнай нагрузкі на кожнага працаздольнага.

*"Работалі жанчыны, я ж кажу, мы ездзілі ў лес, у план, як казалі, два мужыкі было толька ў нас, ну такія яны ў нас, можа за шэсцьдзесят ім ужо было. А мы ж адны дзяўчаты былі"* (Міёрскі р-н)[58];

*"А маць хадзіла ў калхоз. Капалі рукамі, сеялі, рукамі баранавалі. Тада ж усё рукамі. Какой адскій быў труд! Ну патом і трактара ўжо паявілісь, тада ўжэ..."* (Полацкі р-н)[59];

*"Мама і тры дзеўкі. Мы жылі з ягад і хадзілі на работу... і за жнейкай хадзіла — снапы вязала. Такі работнік”* (Расонскі р-н)[60];

У тых сем'ях, дзе са старэйшых была толькі маці, дзеці адказвалі за хатнюю гаспадарку, пакуль яна працавала ў калгасе, і гэта не абмяркоўвалася:

*"Как у всех. Мать уходила на работу и приказывала: накормиш кабана, курей, с коровой что надо, если зимой, то накормишь, напоишь. К её приходу поставиш бульбу, сварыш, ну и прочие по хазяйству дела"* (Полацкі р-н)[61].

Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што падлеткі таксама дапамагалі бацькам пад час іх працы ў калгасе:

*"А хадзіла на работу ад 13 гадоў з мамай. Лён палолі, а патом лён ірвалі — я памагала. І жыта жалі і мы памагалі. Трудадні запісвалі вначале на маму, патом ужо на нас"* (Міёрскі р-н)[62];

*“Кагда нашы радзіцелі работалі ўжо у калхозе, лён малацілі, і мы хадзілі і тоже атбівалі, дапамагалі. Я ўжо падрасла і хадзіла снапы ставіць"* (Сенненскі р-н)[63].

З аднаго боку, гэта была рэальная дапамога, бо амаль усе працы ў калгасе даводзілася рабіць сваімі рукамі, а з іншага — дадатковыя працадні, якія на перыяд непаўналецця запісваліся на бацькоў. Акрамя гэтага, палявыя матэрыялы сведчаць пра тое, што ў пасляваенны перыяд дзеці іншы раз падмянялі маці на калгаснай працы (размова вялася ў першую чаргу пра нескладаную сельскагаспадарчую працу), каб яна мела магчымасць зрабіць нешта на ўласнай сядзібе.

Улічваючы сітуацыю з павелічэннем нагрузкі на дарослых і строгай дысцыплінай у калгасах, дзеці дапамагалі не толькі па хатніх справах ці пад час працы ў калгасе, але і выконвалі дадаковыя абавязкі. Адным з распаўсюджаных сюжэтаў з'яўляюцца аповеды пра

тое, як дзеці насілі здаваць абавязковыя пастаўкі (малако, яйкі і г. д.).

"[А молоко, яйца надо было сдавать?] *Молоко я сам насил. В Базылёвке, деревне, километра два-три, приемный пункт и вот туда, молоко в каночки — 8-литровые и несёш туда.* [А со скольки вы так?] *Как стала мочь такую канку насить, так и насил"* (Полацкі р-н)[64].

Апынуўшыся ў крызіснай сітуацыі, калі ва ўмовах разбуранай гаспадаркі існаваў харчовы і таварны дэфіцыт, калі не было чаго купіць і не было чым заплаціць, сяляне выпрацоўвалі свае эканамічныя адаптыўныя практыкі ў залежнасці ад наяўнасці рэсурсаў і патрэбнасцяў. Фінансавая сістэма пасляваеннай вёскі характарызавалася практычна поўнай адсутнасцю грашовых сродкаў у якасці афіцыйнага заробку калгаснікаў. Таму пасляваенны гандаль адыгрываў адну з галоўных роляў у сістэме жыццезабеспячэння вясковай сям'і, бо даваў сродкі для выплаты падаткаў, набыцця неабходных у штодзённым жыцці рэчаў і прадуктаў харчавання. У разглядаемы перыяд большая частка прадуктаў і паслуг, якія выраблялiся сіламі хатніх гаспадарак, ішла на продаж. Асноўнымі месцамі збыту сялянскай прадукцыі былі гарады, мястэчкі, ваенныя гарадкі і чыгуначныя станцыі, дзе насельніцтва магло расплаціцца, бо атрымлівала заробак грашыма. Сельскагаспадарчая прадукцыя для горада ва ўмовах крытычнага узроўню харчовага забеспячэння была вельмі запатрабаванай. Дзеці і падлеткі прымалі актыўны ўдзел у абменна-гандлёвых аперацыях у першыя пасляваенныя гады. Іншы раз дзеці гандлявалі каля рынка, бо гэта была не зусім легальная дзейнасць, але мясцовыя органы парадку з большага не ганялі іх, бо разумелі складанасць сітуацыі. Пераважна рэапізоўваліся прадукты збіральніцтва:

*"Помню мы сабіралі клюкву, а тады ў Баравуху пяшком насілі, стаканам прадавалі. Вясной, з-пад зімы... Насілі прадаваць стаканамі. А есці ж хацелася! Пакупалі людзі, там жа ваенныя афіцэравы жоны былі, купплялі. Раньше формы хлеба былі, бальшые такія былі, цяпер небальшэнькія формы пякуць. І вот такая скібка небальшэнькая, старымі, яшчэ сталінскімі грашамі, 10 рублей тая скібка хлеба. І вось клюкву прададзім, купім 2—3 скібкі хлеба і дамоў прыйдзем. Гэта да рэформы 1948 года было. На базаре прадавалі, сядзелі бабы, хто яйкі прадавай, хто — што, такія скамеечкі былі, хто бульбіны прадаваў і мы прыторнемся"* (Расонскі р-н)[65];

*"Помню, пойдзем з братам, чарніц наберым, як мы там дацягвалі да горада — не помню, сядзем, стакачык прададзём — капеячку. Там нас многа было, чалавек 10. І кажды хочаць прадаць"* (Верхнядзвінскі р-н)[66].

Вельмі кранальнымі з'яўляюцца ўспаміны пра тое, калі дзеці не маглі стрываць і з'ядалі ці аддавалі дарма прадукты, якія павінны былі прадаць. *"Папа, кажыць, схадзі, у нас ужо кароўка была, занясі прадай масла. Стаю ля прылавачку, адзеўшы папін пінжачок нейкі, прышла старуха — глядзіць на маселкі на гэты, ну я аткавырнула... старуха ж галодная, есць хоча, а я тут, багачка такая, прадаю..."* (Верхнядзвінскі р-н)[67].

Прычым з аповедаў вынікала, што бацькі не каралі незадачлівых гандляроў, бо разумелі складанасць сітуацыі, а проста больш не адпраўлялі іх на рынак. Аднак у большасці выпадкаў дзеці ўдзельнічалі ў гандлёвых аперацыях нароўні з дарослымі:

*"Мне уже было больше десяти, в Полоцк насил продавать сметану, яичку. Сам. Пешком. Базар, где была гостиница, был базар крытый. Обычно с кем-то из соседей ходил. Рядом сидишь — выложишь свой товар, и как люди по столько и продаешь"* (Полацкі р-н)[68].

"[А самі хадзілі ў Бігосава на базар?] *Хадзіла. Прадавала яйкі, там масла. Я не знаю сколькі мне было гадоў. Можа 15-ты год быў. Мама ніколі нікуды не хадзіла. Я хадзіла, тата хадзіў. Нам нада былі грошы. Падаткі ж трэба было заплаціць"* (Міёрскі р-н)[69].

Неабходна адзначыць, што іншы раз дзеці наўмысна прапускалі заняткі ў школе, каб рэалізаваць прадукцыю на рынку і атрымаць неабходныя для сям'і грошы:

"[А где базар был близкий?] *Базар — 12 километров, в Воропаево. Туда идёшь. По средам был базар, в школу уже по средам не ходила, ходила на базар.* [Вы ходили, не мама?] *Конечно, мама болела.* [А как вот торговали, вы ж ещё маленькая?] *Малая, а что ж делать было? Надо было.* [А не обманывали на базаре?] *Не, как-то знаете попадались люди в основном хорошие. После войны народ был довольно дружный, и както люди хорошие были"* (тагачасны Дунілавіцкі р-н)[70].

У першыя пасляваенныя гады захоўвалася традыцыя "аддаваць у навуку" дзяцей навучацца розным рамёствам — у мястэчка ці да майстра ў суседнюю вёску. З аднаго боку, гэта было характэрна для традыцыйнага погляду на навучанне дзяцей, бо меркавалася, што, атрымаўшы пэўную "спецыяльнасць", будзе лягчэй пракарміць сям'ю[71], а з іншага — умовы пасляваенных гадоў унеслі пэўныя карэктывы. Вусная гісторыя Віцебшчыны сведчыць, што перш за ўсё гэта закранула дзяўчат, якіх аддавалі вучыцца шыць. Бо калі не хапала самага неабходнага, не было "вольных грошай", каб набыць гатовую рэч, валоданне швейным рамяством прыносіла стабільны прыбытак у сям'ю.

*"Нада ж было якую сітцэвую сукенку... Дык гатовыя не куплялі, а шылі, партніхі былі. У мяне сястра старейшая вучылася і шыла. Яна зарабляла капейкі"* (Глыбоцкі р-н)[72].

Прычым гэтая традыцыя захоўвалася і ў першай палове 1950-х гадоў. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць, што прафесія краўчыхі была вельмі запатрабаваная, і бацькі свядома ішлі на значныя выдаткі, звязаныя з вучобай дачкі, бо неабходным элементам навучання была наяўнасць швейнай машынкі, якая каштавала вялікія грошы. Успаміны з заходніх раёнаў сведчаць пра тое, што дзяўчынак таемна адпраўлялі вучыцца шыць. У гэтым выпадку дзяўчаткі кідалі школу і асвойвалі спецыяльнасць у хатніх умовах. Вельмі красамоўна пра гэта ўзгадвае Феафанія Іосіфаўна, якая скончыла толькі 4 класы, а потым пайшла вучыцца да краўчыхі ў суседнюю вёску, бо, як яна сама тлумачыла, трэба было падымаць двух малодшых братоў: *"У Зябках была партніха. І тады папа прадаў пуню і купіў машынку. Усе грошы*

*за пуню пайшлі на вучобу. Яна мне паказала як крой і шыць, і на машынке навучыла. Год я ў яе жыла. Да яе прыходзілі з налогаў, тады я хавалася пад ложак. Яна вучыла і абшывала"* (Глыбоцкі р-н)[73].

Увогуле сюжэт пра тое, што старэйшыя дзеці ў сям'і былі вымушаныя прыпыніць навучанне і ісці працаваць для дапамогі бацькам, часта сустракаецца ва ўспамінах пра пасляваенную рэчаіснасць. У той жа час малодшыя мелі магчымасць працягнуць навучанне, атрымаць прафесійную адукацыю, уладкавацца ў жыцці. Безумоўна, у кожным выпадку былі свае абставіны. Самымі частымі з'яўляліся: неспрыяльныя ўмовы і цяжкае становішча сям'і, нежаданне працягваць вучобу, бо было далёка хадзіць і цяжка вучыцца і г. д. Аднак палявыя матэрыялы фіксуюць, што выбар будучыні дзяцей залежаў і ад пазіцыі бацькоў, якія кіраваліся сваім асабістым вопытам:

"[А чего папка не отпускал?] *Дома работы хватает. "Я один класс кончил, в колхозе работаю, заместителем председателя колхоза, и ты проживёшь"* (Глыбоцкі р-н)[74]";

"Ой, *каб сягодня паглядзела маладзеж, як мы тады робілі! Што ж маладая саўсем была, сталі раць, сталі пахаць. Мама кажыць: "Мне твая учоба ні нада, бацька бальны, я бальная", — а нам робіць нада. У плуг шэсць чалавек становіцца, сёмы ў сярэдзіне, тры чалавекі па баках, а задзе ідець плуг.* [Так, а вы з якога часу пачалі рабіць у калгасе?] *Як толькі вайна кончылася, так і пашла робіць, мама не пусціла мяне на ўчобу, сястру меншую научылі. А я старшая была"* (Полацкі р-н)[75].

Некаторыя бацькі лічылі, што адукацыя, асабліва для дзяўчынкі, справа другасная, і нават насілі настаўнікам хабар, каб тыя закрывалі вочы на адсутнасць дачкі ў школе.

Такім чынам, успаміны вясковых жыхароў Віцебшчыны пра пасляваеннае жыццё сведчаць пра тое, што ва ўмовах складанай рэчаіснасці, спецыфічнай дэмаграфічнай сітуацыі дзеці і падлеткі адыгрывалі значную ролю ў сістэме жыццезабеспячэння сялянскай сям'і. З аднаго боку, кожная ўзроставая група выконвала пэўныя абавязкі ў іх класічнай варыяцыі, з другога — размываліся традыцыйныя палаўзроставыя абмежаванні для выканання сельскагаспадарчай працы. Перш за ўсё гэта адбілася на дзяўчатах, якія ва ўмовах дэмаграфічнага дысбалансу выконвалі акрамя традыцыйных жаночых абавязкаў па гаспадарцы і мужчынскі блок сельскагаспадарчай працы. Напэўна, не было ніводнай сферы ў сістэме жыццезабеспячэння, у якой бы была задзейнічана толькі адна катэгорыя насельніцтва. Дзеці і падлеткі не толькі дапамагалі па хатняй гаспадарцы, але пры неабходнасці станавіліся здабытчыкамі патрэбных прадуктаў харчавання і рэсурсаў для яе аднаўлення. Яны актыўна прымалі пасільны ўдзел у абменна-гандлёвых аперацыях. Акрамя гэтага, палявыя даследаванні сведчаць, што звычайнай практыкай была дапамога маці ў калгасе ці падмена маці на калгаснай працы, каб даць ёй магчымасць выканаць нейкія работы на сваім падворку. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць занальную спецыфіку рэгіёна, якая прадвызначыла ролю і месца дзяцей і падлеткаў у сістэме жыццязабеспячэння вясковага насельніцтва Віцебшчыны.

Безумоўна, вусны дыскурс-шматпланавы і разнастайны. Кожны ўспамін — гэта гісторыя канкрэтнай сям'і, асобы, якая жыла ў пэўных умовах, арыентуючыся на адпаведную сістэму жыццёвых каштоўнасцяў. Аднак на ўласны жыццёвы досвед уплывала прыналежнасць да пэўнай лакальнай грамады, сацыяльна-культурнага асяроддзя, эканамічнага ўкладу, у межах якога жыла адпаведная сям'я. Усё гэта вызначала свой універсальны алгарытм паводзінаў, выбар жыццёвай стратэгіі і адаптыўных практык жыццезабеспячэння на пэўным этапе, якія могуць характарызаваць не толькі жыццё пэўнай сям'і, але і вясковага соцыума і грамадства ў цэлым.

---

[1] З мэтай захавання прыватнасці асабістых даных прыводзяцца толькі ініцыялы рэспандэнтаў і пазначаецца пол: Ж — жанчына, М — мужчына. Запісы захоўваюцца ў Цэнтры вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама ў асабістым архіве аўтара.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 4-п, воп. 29, спр. 267, арк. 10.

[3] Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (далей — ЗДА г. Полацка). Ф. 1093, воп. 1, спр. 9, арк. 13.

[4] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей — ФА ПДУ). Запісала, запісаў (далей — Зап.) Сумко А. у 2019 г. ад КНА (Ж), 1928 г., у в. Янкавічы Расонскага р-на.

[5]Там жа. Зал. Сумко А. у 2019 г. ад АЛІ (Ж), 1937 г. н., у в. Горспля Расонскага р-на.

[6] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 46, спр. 148, арк. 157.

[7] Там жа. Арк. 158.

[8] Там жа.

[9] Зал. Сумко А. у 2021 г. ад НВМ (Ж), 1936 г. н. (нар. у в. Поташня Міёрскага р-на), в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[10] ФА ПДУ. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад БМС (Ж), 1943 г. н., в. Цвеціна Міёрскага р-на.

[11] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2020 г. ад ШВП (Ж), 1934 г. н., в. Парадні Міёрскага р-на.

[12] Там жа. Зап. студэнт гр. 17-ГІС: Жэгула К. у 2021 г. ад КНГ (Ж), 1929 г. н. (нар. у Сенненскім р-не), Віцебск.

[13]Там жа. Зап. Сумко А. у 2020 г. ад КАЯ (Ж), 1936 г. н., в. Хралы Глыбоцкага р-на.

[14]Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2019 г. ад СПА (М), 1938 г. н., в. Сядлова Расонскага р-на.

[15]Там жа. Зап. студэнты гр. 18-ГІС. Жукаў Д., Бондар І., Цыганкова А. у 2019 г. ад ЛГС (М), 1938 г. н., в. Шпакоўшчына Полацкага р-на.

[16] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ЮМА (Ж), 1930 г. н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на.

[17]ФА ПДУ. Зап. Сумко А. 29.03.2019 г. ад ВТІ (Ж), 1935 г. н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[18] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ЮМА (Ж), 1930 г. н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на.

[19] ФА ПДУ. Зап. Аўсейчык У. у 2019 г. ад ГЛФ (Ж), 1940 г. н., в. Цвеціна Міёрскі р-н.

[20]Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2019 г. от КНД (Ж), 1935 г. н. (нар. у в. Барэйкі), в. Ламашы Глыбоцкага р-на.

[21] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 29, спр. 267, арк. 35.

[22] ФА ПДУ. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад ТЛЯ (Ж), 1927 г.н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[23] Там жа. Зап. Лобачам У.А., Сумко А.В. у 2018 г. ад ГФІ (Ж), 1940 г. н., в. Калечполе Глыбоцкага р-на.

[24] Там жа. Зап. Лобач У. у 2019 г. ад ШВІ (Ж), 1929 г. н. в. Янкавічы Расонскага р-на.

[25] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ЮМА (Ж), 1930 г. н„ в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на.

[26] ФА ПДУ. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад КНА (Ж), 1928 г. н., в. Янкавічы Расонскага р-на.

[27] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад ТЛЯ (Ж), 1927 г. н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[28] Зап. Сумко А. у 2019 г. ад ВТІ (Ж), 1935 г. н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[29] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад АЛІ (Ж), 1937 г. н., в. Горспля Расонскага р-на.

[30] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2016 г. ад ПМП (Ж), 1937 г. н., в. Казімірова Полацкага р-на.

[31] Там жа. Зап. студэнтам групы 16-ГІС. Мяховічам П. у 2019 г. ад М., 1933 г. н., в. Кавалеўшчына Глыбоцкага р-на.

[32] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад РВІ (Ж), 1931 г. н„ в. Узмёны Міёрскага р-на.

[33] Там жа.

[34] ФА ПДУ. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад КНІ (Ж), 1932 г. н., в. Сіроціна Шумілінскага р-на.

[35] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ЛІМ (Ж), 1930 г. н., в. Цясты Верхнядзвінскага р-на.

[36] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад АФ (Ж), (нар. у в. Верхнія Глыбоцкага р-на) 1929 г. н., в. Верацеі Пастаўскага р-на.

[37] ФА ПДУ. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад АЛІ (Ж), 1937 г. н., в. Горспля Расонскага р-на.

[38] Там жа. Зап. Аўсейчык У. у 2019 г. ад ВФУ (Ж), 1938 г. н., в. Папшулі Міёрскага р-на.

[39] Там жа. Зап. Аўсейчык У. у 2019 г. ад ЛПЯ (Ж), 1936 г. н. (нар. у в. Беляны Верхнядзвінскага р-на).

[40] Там жа. Зап. студэнт гр. 18-ГІС. Сяргун В. у 2018 г. ад ЯСА (Ж), 1927 г.н., в. Ёдлавічы, Браслаўскага р-на.

[41] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2020 г. ад КМІ (М), 1935 г. н., в. Воцькавічы Ушацкага р-на.

[42] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ФЮВ (Ж), 1932 г. н. (в. Немцы Росіцкага с/с), в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на.

[43] Зап. Сумко А. у 2020 г. ад ШК (Ж), 1932 г. н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[44] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ФЮВ (Ж), 1932 г. н. (в. Немцы Росіцкага с/с), у в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на.

[45] ФА ПДУ. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад БМС (Ж), 1943 г. н., в . Цвеціна Міёрскага р-на.

[46] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад СВМ (М), 1936 г. н., в. Мураўі Полацкага р-на.

[47] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад АЛІ (Ж), 1937 г. н., в. Горспля Расонскага р-на.

[48] Там жа. Зап. Сумко А.В. у 29.03.2019 ад ВТІ (Ж), 1935 г. н., в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[49] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад АЛІ (Ж), 1937 г. н., в. Горспля Расонскага р-на

[50] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2019 г. ад ММВ (М), 1926 г. н., в. Ламашы Глыбоцкага р-на.

[51] Там жа. Зап. студэнт гр. 17-ГІС Жэгула К. у 2021 г. ад КНГ (Ж), 1929 г. н. (нар. у Сенненскім р-не), Віцебск.

[52] Там жа. Зап. Сумко А. у 2020 г. ад ЛЕ (Ж.), 1936 г. н., в. Асвея Верхнядзвінскага р-на.

[53] Там жа. Зап. Сумко А. у 2020 ад ЧЗМ (Ж), 1939 г., в. Заазер’е Полацкага р-на.

[54] Там жа. Зап. Сумко А. у 2020 г. ад ШЛМ (Ж), 1940 г. н., в. Дворнае Сяло Міёрскага р-на.

[55] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад КНА (Ж), 1928 г., в. Янкавічы Расонскага р-на.

[56] Там жа.

[57] ЗДА г. Полацка. Ф. 1093, воп. 1, спр. 2, арк. 13.

[58] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад РВІ (Ж), з 1931 г. н., у в. Узмёны Міёрскага р-на.

[59] ФА ПДУ. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад РФА (М), 1937 г. н., в. Загацце Полацкага р-на.

[60] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад АЛІ (Ж), 1937 г. н., в. Горспля Расонскага р-на.

[61] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад БМВ (М), 1942 г. н., в. Асёткі Полацкага р-на.

[62] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад БМС (Ж), 1943 г. н., в. Цвеціна Міёрскага р-на.

[63] Там жа. Зап. студэнт гр. 17-ГІС Жэгула К. у 2021 г. ад КНГ (Ж), 1929 г.н. (нар. у Сенненскім р-не), Віцебск.

[64] Там жа. Зап. Сумко А. в 2019 г. ад БМВ (М), 1942 г. н., у в. Асёткі Полацкага р-на.

[65] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад ВТІ (Ж), 1935 г. н., у в. Галоўчыцы Расонскага р-на.

[66] Там жа. Зап. Сумко А. у 2018 г. ад ад ГВК (Ж), 1941 г. н., в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

[67] Зап. Сумко А. у 2021 г. ад ЮМА (Ж), 1930 г. н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на.

[68] ФА ПДУ. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад БМВ (М), 1942 г.н., в. Асёткі Полацкага р-на.

[69] Там жа. Зап. Сумко А. у 2019 г. ад ШЗМ (Ж), 1930 г. н., в. Пуцінава Міёрскага р-на.

[70] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. в 2019 г. от КНД (Ж), 1935 г. р. (нар. у в. Барэйкі), в. Ламашы Глыбоцкага р-на.

[71] Ракава Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. Мн., 2000. С. 17—18.

[72] ФА ПДУ. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад МАА (Ж), 1936 г. н., в. Чарневічы Глыбоцкага р-на.

[73] Там жа. Зап. Сумко А.В. у 2018 г. ад ГФІ (Ж), 1940 г. н., в. Калечполле Глыбоцкага р-на.

[74] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. в 2019 г. от КНД (Ж), 1935 г. р. (нар. у в. Барэйкі), в. Ламашы Глыбоцкага р-на.

[75] Там жа. Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад ММФ (Ж), 1931 г. н., в. Мураўшчына Полацкага р-на.